## Подсекция «БЕЛОРУССКОЕ И РУССКОЕ ЯЗЫКОЗНАНИЕ И ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ»

УДК 811.161.3’276.1

В. У. Русак, заг. кафедры, канд. філал. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# СКЛАД ТЭМАТЫЧНЫХ ГРУП ТЭРМІНАЎ «НАЗВЫ ТЫПАЎ, СКЛАДНІКАЎ, ХАРАКТАРЫСТЫК ЛЕСУ», «НАЗВЫ ВІДАЎ, УЛАСЦІВАСЦЕЙ, ХАРАКТАРЫСТЫК ДРЭЎ, ДРЭВАВЫХ ПАРОД І ДРЭВАСТОЮ»

Адно з цэнтральных пытанняў сучаснай лінгвістыкі – пытанне аб сістэмнасці мовы, якая праяўляецца ў сукупнасці элементаў, звязаных унутранымі адносінамі. Лексічны склад мовы не з’яўляецца выключэннем. Ён уяўляе сабой сукупнасць адзінак, узаемазвязаных парадыгматычнымі і сінтагматычнымі адносінамі, на аснове якіх вылучаюцца тэматычныя і лексіка-семантычныя групы лексікі.

Існуюць розныя трактоўкі паняцця *тэматычная група*. На нашу думку, дастаткова дакладнай і трапнай з’яўляецца фармуліроўка М. Ф. Алефірэнкі: «Тэматычная група – сукупнасць слоў розных часцін мовы, звязаных паміж сабой тэматычна на аснове экстралінгвістычных параметраў [1, с. 119].

Надзвычай важна размеркаванне адзінак па тэматычным прынцыпе ў тэрміналогіі. Яно дазваляе сістэматызаваць фактычны матэрыял на паняційнай аснове, а таксама прадэманстраваць узаемасувязь элементаў унутры кожнай групы. Па назіраннях вучоных, «што датычыцца непасрэдна галіновай тэрміналогіі, то класіфікацыя яе па той ці іншай прымеце будзе мець кожны раз свой, непаўторны характар, асабліва калі ўнутры тэрміналагічных аб’яднанняў, утвораных на аснове ўніверсальных катэгорый паняццяў, вылучыць тэматычныя групы <…> Вылучэнне тэрміналагічных груп з тэрміналагічнага слоя дае магчымасць выявіць разнастайныя лексіка-семантычныя працэсы, якія адлюстраваны ў навуковым маўленні пры дапамозе тэрміналагічных адзінак» [2, с. 48].

Сучасная беларуская тэрміналогія лясной гаспадаркі патрабуе дэталёвага апісання і сістэматызацыі. Класіфікацыя лесагаспадарчых тэрмінаў на паняційнай аснове дазволіць ацаніць наяўны тэрміналагічны матэрыял, дапоўніць і ўдакладніць яго, што, у сваю чаргу, можа быць выкарыстана пры падрыхтоўцы актуальнага слоўніка беларускіх лесагаспадарчых тэрмінаў.

У дадзенай рабоце мы разгледзелі склад дзвюх тэматычных груп тэрмінаў «Назвы тыпаў, складнікаў, характарыстык лесу», «Назвы відаў, уласцівасцей, характарыстык дрэва і дрэвастою». Лес і дрэва –

галоўныя аб'екты лясной гаспадаркі; яны могуць быць ахарактарызаваны з улікам розных прымет і крытэрыяў, а таму названыя тэматычныя групы досыць вялікія і падзяляюцца на шэраг падгруп і мікрагруп.

**Група «Назвы тыпаў, складнікаў і характарыстык лесу»** мае наступную структуру: 1) тыпы лесу; 2) складнікі, кампаненты, характарыстыкі лесу і лесасек; 3) ацэначныя параметры і функцыі лесу.

Падгрупа «Тыпы лесу» дзеліцца на шэраг мікрагруп у залежнасці ад крытэрыю, па якім ажыццяўляецца падзел на тыпы:

а) па дамінантнай дрэвавай пародзе: *букавы лес*, *вербавы лес*, *альховы лес*, *вязавы лес*, *грабавы лес*, *ліпавы лес*, *сасновы лес*, *яловы лес*, *кляновы лес*, *бярозавы лес*, *асінавы лес*, *чорнаальховы лес*, *шэраальховы лес*, *мяшаны лес*;

б) тыпу глебы: *балотны лес*, *пойменны лес*, *сухадольны лес*, *забалочваемы лес*;

в) гушчыні насаджэнняў: *рэдкалессе*, *прарэджаны лес*, *густы лес*, *суцэльны лес*;

г) функцыях: *берагаахоўныя лясы*, *водаахоўныя лясы*, *супрацьэразійныя лясы*, *рэкрэацыйныя лясы*;

д) прыналежнасці да тэрыторыі або аб'екта: *гарадскія лясы*, *запаведныя лясы*, *курортныя лясы*;

е) месцазнаходжанні і кліматычных умовах: *горныя лясы*, *астраўныя лясы*, *трапічныя лясы*, *прытундравыя лясы*;

ж) форме вядзення лясной гаспадаркі: *высакаствольны лес*, *сярэдняствольны і нізкаствольны лес*;

з) перыяду наяўнасці лісця: *вечназялёны лес*, *летнезялёны лес*.

Трэба браць пад увагу той факт, што назвы некаторых тыпаў лясоў не ўтвараюць груп: *эталонны лес*, *крывалессе* і інш.

Падгрупа «Складнікі, кампаненты, характарыстыкі лесу і лесасек» дзеліцца на мікрагрупы наступным чынам:

а) кампаненты ляснога насаджэння: *лясное насаджэнне*, *дрэвастой*, *падрост*, *падлесак*, *падгон*, *жывое надглебавае покрыва*, *лясны подсціл*, *лясная фаўна*, *пазаярусная расліннасць*, *самасеў*, *раслінны апад*;

б) складнікі, характарыстыкі і параметры лесасек: *дзялянка лесасечная*, *спосаб прымыкання лесасек*, *разліковая лесасека*, *напрамак лесасекі*, *форма лесасекі*, *шырыня лесасекі*;

в) складнікі, характарыстыкі і працэсы ляснога і лесасечнага фонду: *выдзел таксацыйны*, *эксплуатацыйны лясны фонд*, *землі лесагаспадарчага прызначэння*, *інвентарызацыя ляснога фонду*, *сенакосныя лясы меліярацыйнага фонду*, *сартыментны склад лесасечнага фонду*, *лясныя землі*, *нелясныя землі*.

Падгрупа «Ацэначныя характарыстыкі і функцыі лесу» склада-

ецца з наступных мікрагруп:

а) ацэначныя характарыстыкі лесу: *глыбіня лесу*, *дэградацыя лясоў*, *занальнасць лясоў*, *лясістасць*, *прадуктыўнасць лясоў*;

б) функцыі лесу: *водаахоўная функцыя лесу*, *водарэгулюючая функцыя лесу*, *ахоўная функцыя лесу*, *супрацьэразійная функцыя лесу*, *культурная функцыя лесу*, *біягеахімічная функцыя лесу*.

**Група «Назвы відаў, уласцівасцей, характарыстык дрэў, дрэвавых парод і дрэвастою»** складаецца з наступных падгруп: 1) віды дрэў і дрэвавых парод; 2) часткі дрэва; 3) віды дрэвастою; 4) лесаводча-таксацыйныя паказчыкі дрэвастою.

Падгрупа «Віды дрэў і дрэвавых парод» уключае мікрагрупы:

а) віды дрэвавых парод (па разнастайных класіфікацыйных прыметах: разнавіднасці лісця, адносінах да цяпла, святла, вільгаці, урадлівасці глебы і інш.): *хваёвыя пароды*, *лісцевыя пароды*; *святлолюбівыя пароды*, *ценевынослівыя пароды*, *цеплалюбівыя пароды*, *ультраксерафіты*, *ксерафіты*, *мезаксерафіты*, *мезагіграфіты*, *гіграфіты*, *алігатрофы*, *мегатрофы*, *мезатрофы*, *ацыдафілы*, *кальцафілы*;

б) віды дрэў па селекцыйнай ацэнцы і тэхнічнай прыдатнасці: *плюсавое дрэва*, *нармальнае дрэва*, *мінусавое дрэва*, *дзелавое дрэва*, *таварнае дрэва*, *мадэльнае дрэва*.

Падгрупа «Часткі дрэва»: *крона*, *лісце*, *ствол*, *галіны*, *верхавіна*, *камель*, *кара*, *камбій*, *абалона*, *сарцавіна*, *ядро*, *карані*, *карнявая сістэма*, *гадавыя кольцы*.

Падгрупа «Віды дрэвастою»: *шматʼярусны дрэвастой*, *дрэвастой вегетатыўнага паходжання*, *карэнны дрэвастой*, *спелы дрэвастой*, *маладняк*, *пераспелы дрэвастой*.

Падгрупа «Лесаводча-таксацыйныя паказчыкі дрэвастою»: *паходжанне дрэвастою*, *форма дрэвастою*, *ярус дрэвастою*, *састаў дрэвастою*, *узрост дрэвастою*, *банітэт дрэвастою*, *паўната дрэвастою*, *самкнутаць дрэвастою*, *гушчыня дрэвастою*.

Класіфікацыя тэрмінаў па тэматычным прынцыпе – важны этап у тэрміналагічнай рабоце. Аналіз слоў, абʼяднаных у групы ў залежнасці ад іх значэння, дазваляе выявіць сінанімічныя, антанімічныя абʼяднанні, зафіксаваць мнагазначнасць і аманімію і ўлічыць гэта пры стварэнні тэрмінасістэмы.

ЛІТАРАТУРА

1. Алефиренко, Н. Ф. Теория языка: введение в общее языкознание: учеб. пособие. Волгоград: Перемена, 1981. 342 с.

2. Багана Ж., Таранова Е.Н. Роль тематической классификации в терминологических исследованиях // Вестник Российского университета дружбы народов. Сер. Лингвистика. 2010. №3. С. 46–49.